БДУКМ на кафедры этналогіі і фальклору, паспяхова працяг-ваецца і сёння, што дае магчымасць напрыканцы артыкула зрабіць наступныя высновы.

1. Інавацыйныя змены ў этнамастацай адукацыі Беларусі па-чатку XXI ст. увасобіліся ў адкрыцці новых напрамкаў адукацыі і стварэнні ў сістэме УВА структур, якія забяспечва-юць патрэбу краіны ў спецыялістах-практыках па захаванні НКС для ўстаноў культуры новага тыпу.

2. З'яўленне спецыялістаў галіны практычнай фалькла-рыстыкі – з'ява, абумоўленая перабудовай навучання ва УВА Беларусі ў мэтах выканання запатрабаванняў дзяржавы як асноўнага інвестара этнамастацкай адукацыі.

3. Актуальнасць этнамастацкай адукацыі сёння дазваляе ёй (пры стварэнні адпаведных умоў) выконваць шэраг камерцый-ных функцый.


1. *Калацэй, В.* Асобы / В. Калацэй // ЛіМ, 2013. – № 51. – 27 снеж. 2013 г. – С. 13.

2. *Нікіценка, І.* Даследаваць аўтэнтычны фальклор, каб перадаць яго маладому пакаленню / І. Нікіценка // Настаўніцкая газета, 2011. – № 49. – 3 ліст. 2011 г. – С. 8.

3. *Песнякевіч, Т.* Крыніца з патэнцыялам ракі / Т. Песнякевіч // ЛіМ, 2011. – № 44. – 4 ліст. 2011 г. – С. 19.

4. Я – гражданин Республики Беларусь / ред. совет: Т. Н. Ковалева [и др.] – Минск : Пачат. шк., 2007. – 312 с.

5. *Zabieliene, A.* Folkloro ansambliai dabartineje Lietuvoje: etnologinis aspektas / A. Zabieliene. – Vilnius : Firidas, 2010. – 262 psl.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А. А. Караткевіч,** *старшы выкладчык кафедры духавой музыкі*

# УМОВЫ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ТРУБАЧОЎ У СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

Сучасны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў музычнага мастацтва прад'яўляе шэраг сур'ёзных патрабаванняў да іх кваліфікацыі. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да спецыялістаў, якія вывучаюцца ігры на трубе ў розных УВА Беларусі: Бела-рускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а таксама у яе філіяле ў г. Магілёве (спецыяльнасць «духавыя інструменты»); Беларус-

кім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (спецыяльнасці: «інструментальная музыка духавая», «мастацтва эстрады»); Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы (спецыяльнасці: «інструментальная музыка духавая», «мастацтва эстрады»).

Адзначым, што праблема арганізацыі самастойнай работы студэнтаў выклікае пэўны інтарэс у спецыялістаў вышэйшай школы. Так, напрыклад, з 1–2 лютага 2001 г. у БДУК была арганізавана тэматычная навукова-метадычная канферэнцыя па псіхолага-педагагічных і метадычных праблемах актывізацыі самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў [8]. Гэту праблему разглядалі і ўдзельнікі 2-й навуковай рэспубліканскай канферэнцыі па праблемах актуальнай сучаснай гуманітарнай адукацыі, якая была праведзена ў РІВШ 24 лістапада 2005 г. [1, с.182, 187, 188], а таксама была праведзена навукова-метадычная канферэнцыя (14 лютага 2008 г.) у БДУКМ па праблемах павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў [10]. Праблема вывучалася такімі аўтарамі, як В. Волкаў, М. Волкаў, Т. Дакшыцар, А. Карацееў, А. Караткевіч.

З мэтай вырашэння розных задач даследавання, сярод якіх аналіз вывучэння тэхналагічных асаблівасцей выканання студэнтамі на інструменце, планаванне іх заняткаў, вывучэнне нотнай літаратуры і г. д., мы выкарыстоўвалі наступныя методыкі:

– аналітычны агляд станаўлення і развіцця сістэмы навучання ігры на трубе (у тым ліку самападрыхтоўка выканаўцаў на прыкладах XVI–XVIII стст. і сучаснага перыяду);

– інтэрв’юіраванне (апытанне выкладчыкаў і студэнтаў аб арганізацыі сістэмы самастойных заняткаў);

– уключанае назіранне (аналіз папярэдніх і асноўных этапаў працэсу выканання студэнтамі самастойных індывідуальных заняткаў);

– эксперыментальны метад (апрабацыя аб’ёму і зместу заданняў для самастойнай работы студэнтаў з мэтай развіцця іх навыкаў да самападрыхтоўкі).

Праведзенае даследаванне дазволіла вызначыць, што галоўная мэта арганізацыі самастойнай работы студэнтаў – гэта мэтанакіраванае ўдасканаленне тых выканальніцкіх навыкаў, якія студэнты атрымалі ў час навучання на базавым духавым інструменце ў музычных вучылішчах, каледжах мастацтваў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры і інш. Акрамя гэтага арганізацыя самастойнай работы студэнтаў ва УВА з’яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі будучых маладых спецыялістаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці ў сферы культуры і мастацтваў.

Вынікі праведзенага даследавання па выкананні патрабаванняў навучальнага працэсу студэнтамі адпаведных мастацкіх спецыялізацый пацвердзілі, што самастойная работа, якая грунтуецца на агульнапедагагічных прынцыпах, з’яўляецца неад’емнай часткай усяго вучэбна-выхаваўчага працэсу ва УВА. Як вызначае адзін з даследчыкаў праблемы арганізацыі самастойнай работы студэнтаў М. Шутава, «самостоятельная работа вне аудитории должна быть управляемой и целенаправленной (прежде всего на начальном этапе). Задания для самостоятельной работы должны быть рассчитаны именно на эти условия. Умения, знания того, как работать, является одним из факторов, определяющих успешность самостоятельной работы. Это означает, что правильно организованная самостоятельная работа должна быть подготовлена в аудитории» [1, с. 187].

Адна з галоўных умоў падрыхтоўкі студэнтаў, якія навучаюцца ігры на трубе, з’яўляецца састаўленне розных відаў планаў па іх самападрыхтоўцы. На наш погляд, найбольш эфектыўнымі будуць наступныя тыпы планаў.

*План самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам.* Гэты план прадугледжвае вызначэнне студэнтамі асноўных этапаў работы над неабходнымі практыкаваннямі на трубе, вывучэнне гам, эцюдаў на розныя віды тэхнікі.

*План самастойнай работы над музычнымі творамі.* Гэта разнастайнасць плана, які ўказвае студэнтам, як рацыянальна арганізаваць адпаведныя віды заняткаў па развіцці асабістых выканальніцкіх навыкаў у працэсе работы над камерна-інструментальнымі творамі кампазітараў-класікаў і сучасных аўтараў, у тым ліку Беларусі.

*План самастойнай работы па вывучэнні аркестравых і ансамблевых партый.* Гэты план дазволіць студэнтам вызначаць найбольш складаныя мастацкія і тэхналагічна-выканальніцкія асаблівасці, выканаць неабходны аб’ём работы ў кожным музычным творы.

Як паказалі матэрыялы праведзенага даследавання, у розных УВА культуры і мастацтваў студэнты разглядаемых спецыяльнасцей ажыццяўляюць развіццё мастацкіх выканальніцкіх навыкаў ігры на трубе па наступных кірунках:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыя самастойных ранішніх заняткаў без выкладчыка з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату для работы над заданнямі ў час сустрэчы ва аўдыторыі з выкладчыкам ці да заняткаў на рэпетыцыі ансамбля, аркестра (папярэднія практыкаванні па падрыхтоўцы выканальніцкага дыхання без інструмента, а потым з інструментам; вызначэнне гатоўнасці дыяфрагмы; вызначэнне гатоўнасці апертуры і амбушура пры дапамозе практыкаванняў па сістэме «basing» і іх магчымая карэктура пры дапамозе цюнера ці фартэпіяна; вызначэнне сістэмы заняткаў над падоўжанымі гукамі ў варыянтах з рознай дынамікай – p, mp, mf, f ці ў яе кантрасных градацыях – mp–mf, mf–f, p–f; асноўная дадатковая аплікатура ў павольных і сярэдніх тэмпах.

Вызначэнне абавязковых папярэдніх заданняў з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату да заняткаў ва аўдыторыі з выкладчыкам ці рэпетыцыі ансамбля, аркестра (папярэднія практыкаванні, уключаючы варыянты кантраснага супастаўлення кантылентных фрагментаў са складанымі тэхнічнымі камбінацыямі; вызначэнне выканальніцкіх задач па засваенні ўсіх відаў работы над гамамі, у тым ліку розныя штрыхавыя камбінацыі; падбор эцюдаў на розныя выканальніцкія задачы і віды выканальніцкай тэхнікі; дасягненне дакладнага выканання абертонаў (узыходзячыя і зыходзячыя); чаргаванне камбінацый на падставе скачкападобных варыянтаў).

Адпаведная карэктура інтанавання, якая абумоўлена неабходнасцю пастаяннага кантролю ў час ігры з канцэртмайстрам на аўдыторных занятках з выкладчыкам.

Адным з эфектыўных кірункаў развіцця самастойных навыкаў па атрыманні неабходных прафесійных ведаў на сучасным этапе навучання ва УВА з'яўляецца, на думку В. Сергеенкавай, модульна-рэйтынгавая сістэма кантролю. Разглядаючы гэту сістэму вучэбнага працэсу ва УВА, даследчык адзначае, што яна «дает возможность объективно и развернуто оценить знания студента по изучаемой дисциплине в виде его рейтинга. Рейтинг студентов может быть разных уровней: рейтинг на занятии; рейтинг по каждому модулю; рейтинг по отдельной дисциплине; рейтинг студента по кафедральным дисциплинам, если преподаватели кафедры работают по модульно-рейтинговой системе; общий рейтинг студента. Рейтинг может быть использован при любой аттестации студентов» [9, с. 27].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Модульна-рэйтынгавая сістэма адносна навучальнага працэсу нам, выкладчыкам выпускаючай кафедры, дае магчымасць улічваць ступень выканання студэнтамі вучэбных заданняў у час іх самастойных заняткаў (выкананне камерна-інструментальных твораў, а таксама ансамблевых і аркестравых; прагрэс і рэгрэс у засваенні віртуознай тэхнікі; якасць выканання канцэртных праграм кафедры і інш.).

З мэтай стымулявання вынікаў самастойнай работы студэнтаў неабходна вызначыць і адпаведныя меры іх заахвочвання, сярод якіх аб’ява падзякі, прэмія, надбаўка да стыпендыі хадайніцтва аб накіраванні ў магістратуру, размеркаванне пасля ўніверсітэта на прэстыжнае несца працы і г. д.

Акрамя гэтага, як адзначае В. Сергеенкава, «обязательным условием внедрения модульно-рейтинговой системы является обеспечение студентов необходимой учебно-методической литературой» [9, с. 23]. Сярод выданняў гэтай спецыяльнай літаратуры найбольш карысным, на наш погляд, з’яўляюцца работы В. Волкава [2], М. Волкава [3], А. Карацеева [6] і інш.

Такім чынам, аналіз вынікаў праведзенага даследавання сведчыць, што існуе непаразуменне значнасці і неабходнасці самастойнай работы студэнтаў як з боку выкладчыкаў выпускаючых кафедр, так і саміх студэнтаў. Заняткі па развіцці творча-выканальніцкіх навыкаў студэнтаў абмяжоўваюцца шматразовым выкананнем тых ці іншых музычных фрагментаў у час заняткаў з выкладчыкам у аўдыторыі, а таксама працягам гэтага трэнажу ў час пазааўдыторных заняткаў з мэтай удасканалення такой спецыфічнай і складанай работы, як так званыя «педальныя гукі». Менавіта гэтай праблеме прысвечана метадычная работа, спецыяльна падрыхтаваная намі для арганізацыі штодзённых самастойных заняткаў трубача [5].

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя вывады.

Самастойная работа студэнтаў УВА культуры і мастацтваў разглядаемых спецыяльнасцей з’яўляецца актуальнай і патрабуе ўсебаковага вывучэння.

Выкладчыкам выпускаючых кафедр для арганізацыі мэтанакіраванага працэсу падрыхтоўкі студэнтаў гэтых спецыяльнасцей неабходна распрацаваць адпаведную дакументацыю (графік кантролю самастойнай работы студэнтаў па спецыяльных дысцыплінах; распрацоўка метадычных рэкамендацый па рабоце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

над вучэбна-метадычнай літаратурай з адпаведным спісам; вызначэнне заданняў па выкананні самастойнай работы і г. д.).

Для дасягнення эфектыўных вынікаў навучальнага працэсу неабходна арганізаваць семінары-практыкумы па пытаннях планавання студэнтамі іх самастойных пазааўдыторных заняткаў, выканання аб'ёму заданняў на адпаведных этапах, ажыццяўлення самакантролю ў час самападрыхтоўкі.

---


*1.* Актуальные проблемы современного гуманитарного образования : материалы 2-й Науч. респ. конф. молодых ученых и аспирантов / ГУО «Республиканский институт высшей школы». – Минск, 2005. – 272 с.

*2. Волков, В. В.* Вопросы теории и практики исполнительства на трубе / В. В. Волков ; под ред. А. Л. Коротеева. – Минск : БАМ, 1999. – 151 с.

*3. Волков, Н. М.* Физические и психофизиологические предпосылки образования звука на трубе и проблемы исполнительской артикуляции : монография / Н. М. Волков. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – 169 с.

*4. Докшицер, Т. А.* Система комплексных занятий трубача. Часть 1. Комплексы малой и средней трудности / Т. А. Докшицер. – М. : ИД «Муравей», 1997. – 80 с.

*5. Караткевіч, А. А.* Педальныя гукі ў сістэме штодзённых самастойных заняткаў трубача : вучэбны матэрыял / А. А. Караткевіч. – Мінск : МІК, 1977. – 17 с.

*6. Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў ; Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск 2–3 лютага 1999 г. ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1999. – С. 91–96.

*7. Коротеев, А. Л.* Самостоятельные ежедневные упражнения на специнструменте как составная часть учебного процесса (медные духовые инструменты: труба, корнет, альт горн, тенор горн, баритон горн): метод. указания с нотными примерами / А. Л. Коротеев. – 2-е изд. – Минск : МИК, 1985. – 36 с.

*8.* Псіхолага-педагагічныя і метадычныя праблемы актывізацыі самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў: матэрыялы навук.-метад. канф. Мінск, 1–2 лютага 2001 г. ; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2001. – 181 с.

*9. Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В. Сергеенкова. – Минск : РИВШ, 2004. – 132 с.

*10.* Шляхі павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў : матэрыялы навук.-метад. канф. (14 лютага 2008 г.) / рэдкал.: Р. А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 218 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ